■ Да ведама

ПАЛЮЙ, АЛЕ ГАЛАВЫ НЕ ГУБЛЯЙ

У сувязі з адкрыццём сезона палявання на самцоў цецерука і глушца Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь нагадвае, што за незаконную здабычу цецерука давядзецца пакрываць нанесеную прыродзе шкоду ў памеры 10 базавых велічынь, за глушца — 70 базавых велічынь, што аўтаматычна цягне за сабой крымінальную адказнасць.

— Каштоўнасць глушца абумоўлена яго нешматлікасцю ў прыродзе Беларусі (менш за 10 тысяч асобін), у той час як цецярук з'яўляецца больш распаўсюджанай птушкай сямейства цецеруковых. Паляванне на глушца цікавае яшчэ і з-за біялагічных асаблівасцяў гэтай птушкі: наблізіцца да яе можна, толькі падгадаўшы момант, калі, такуючы глушэц, па-асабліваму «шчоўкае» і «глухне» на некалькі секунд, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч.

Працягваецца і сезон палявання на вадаплаўную дзічыну: гусь — белалобую і шэрую, гуменніка і канадскую казарку (акрамя некаторых паляўнічых угоддзяў — у асноўным па Брэсцкай і Віцебскай абласцях, дзе да 1 студзеня 2015 года, згодна з пастановай Мінпрыроды, дзейнічае забарона на гэты від палявання). Дзяржінспекцыя звяртае ўвагу паляўнічых на тое, што пры паляванні на птушыных трэба захоўваць правілы бяспекі: не страляць па птушцы, якая ўзлятае ніжэй чым 2,5 метра ва ўмовах абмежаванай бачнасці, на шум, шорах, па няясна бачнай цэлі, у тумане, прыцемках, супраць сонца і пры іншых неспрыяльных умовах.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сяргей РАСОЛЬКА

СТАРТУЕ «ХАКЕЙНЫ #ПЕРАХВАТ!»

Падчас правядзення ў Мінску з 9 па 25 мая чэмпіянату свету па хакеі інтэрнэт-праект ГУУС Мінгарвыканкама «Перахват» абвяшчае кампанію «Хакейны #перахват!»

Яна будзе складацца з двух асноўных этапаў. Першы — конкурс фотаздымкаў інтэрнэт-карыстальнікаў, прымеркаваных да тэматыкі надыходзячага сусветнага першынства. Галоўнай мэтай конкурсу з'яўляецца пошук пазітыўных момантаў пры правядзенні чэмпіянату свету па хакеі. Сюжэтам фотаздымка можа быць усё, што мае дачыненне да тэматыкі будучай дзеі: падзея, з'ява, назіранне, чалавек. Фотаздымкі неабходна накіроўваць на «Перахват» ці размяшчаць у «Твітары» з пазнакай #чм2014 і #перахват.

Другі этап — накіраванне «перахватчыкамі» інфармацыі пра розныя непрыемнасці ў спецыяльна створаную рубрыку. Яе галоўная мэта — дапамога актыўных мінчан у выяўленні і аператыўным выпраўленні праблемных момантаў гарадскога побыту. Гэтая рубрыка будзе дзейнічаць да канца чэмпіянату. У яе можна будзе паведамляць пра аўтахлам, няспраўныя святлафоры і сапсаваныя дарожныя знакі, гарадскіх вандалаў, грубасць і хамства кіроўцаў на дарогах, факты распіцця спіртных напояў і г.д.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ «Еўрабачанне-2014»

Тэа паедзе ў Данію без чызкейкаў, затое з гальштукам-бабачкай

— Тры чамаданы адзення назбіралася! — смяецца выканаўца. Але тут жа пераключаецца на больш сур'ёзны тон і расказвае, што для ўсёй беларускай дэлегацыі стылісты прыдумалі карпаратыўны стыль а-ля «mr Cheesecake»: модныя белыя кашулі (іх, дарэчы, пашылі беларускія вытворцы), класічныя цёмныя нагавіцы і гальштукі-бабачкі. Такі выгляд, як мяркуюць спецыялісты, дапаможа нашай камандзе вылучыцца вонкава ў агульным, зазвычай вельмі яркім, калейдаскопе «Еўрабачання».

У гэтым жа рэчышчы выканана і прома-прадукцыя: дыск і інфармацыйны буклет, які прадстаўляе беларускага артыста, магніты з краявідамі Мінска, а таксама спецыяльныя VIP-сувеніры для калег-тэлевізійнікаў і артыстаў з іншых краін, што ўдзельнічаюць у сёлетнім конкурсе. Дапамагаюць наладжваць стасункі з прадстаўнікамі розных краін і арганізоўваюць розныя піяр-акцыі ажно два піяршчыкі — адзін працуе на рускамоўную аўдыторыю, другая, брытанка Кэтрын Локет, — на англамоўную.

Але галоўнае, што павязе беларускі ўдзельнік на «Еўрабачанне» — безумоўна, сам конкурсны нумар на песню «Cheesecake». Ужо вядома, што ў ім, акрамя ўласна саліста Тэа (Юрыя Вашчука), будуць задзейнічаны бэк-вакалісты Дзяніс Ліс, Арцём Ахпаш і Юрый Селязнёў, а таксама танцоры Аляксандр Залескі і Андрэй Мартынаў.

— Як так атрымалася, што сабраліся «ў джазе толькі хлопчыкі»? — пацікавіліся мы.

— А вы чакалі, што будзе, як у кліпе, дзяўчына-прыгажуня? — ажыўляецца Тэа. — Вельмі часта нават калегі-артысты пытаюцца, ці будзе ўсё, як у кліпе. Я лічу, што прома-кліп і сцэнічны нумар — рэчы зусім розныя: калі кліп здымаецца на якім-небудзь айсбергу, напэўна, не трэба гэты ж айсберг рабіць і на сцэне. Канцэпцыя выступлення даволі простая: мы з сябрамі ў добрым настроі гуляем па вуліцы і спяваем пра тое, што хопіць, нарэшце, называць хлопцаў «салодкімі чызкейкамі», мы ад гэтага ўжо стаміліся. Адпаведна з гэтай задумкай і падбіраліся ўдзельнікі — усе яны насамрэч не толькі мае калегі па сцэне, але і добрыя сябры, выдатныя хлопцы, з якімі вельмі камфортна і лёгка працаваць. Наогул, я лічу, вельмі важна, што сёлета падабралася цудоўная каманда, дзе ўсе разумеюць адзін аднаго.

Увесь мінулы тыдзень спявак працаваў з запрошанымі замежнымі спецыялістамі — шведскай рэжысёркай Ціне Матулесі, якая рабіла пастаноўку нумара, і педагогам па вакале Алексам Панаі з Кіпра, які добра ведае спецыфіку конкурсу як на ўласным прыкладзе, так і па працы з іншымі артыстамі. Памятаючы пра тое, што лепшае — вораг добрага, усім знаёмы варыянт конкурснай песні вырашылі істотна не змяняць, каб не сапсаваць яе, а толькі крыху «дашліфаваць», палепшыць асобныя моманты.

Наколькі гэта ўдалося зрабіць — убачым ужо праз два з паловай тыдні. Пакуль жа «Cheesecake» актыўна падхоплівае публіка на прома-канцэртах, а выканаўца і ўся каманда нацэлены на максімальна добры вынік. Але прагнозы рабіць не бяруцца і пытанні пра магчымую перамогу сустракаюць з усмешкай. «Давайце не будзем заганяць саміх сябе і артыста ў рамкі планаў, якое месца нам трэба заняць, а проста атрымаем задавальненне ад гэтага вялізнага, яркага свята!» — прапануе кіраўнік праекта «Еўрабачанне» ў Беларусі Вольга Шлягер.

Напярэдадні адлёту ў Капенгаген Тэа паспее яшчэ выступіць на вечарынцы ў Маскве, якую ладзяць прадстаўніцы Расіі сёстры Талмачовы з удзелам расійскіх эстрадных «зорак» і канкурсантаў са Швецыі, Румыніі, Азербайджана, Сан-Марына, а таксама возьме актыўны ўдзел ва ўласных «провадах» — афіцыйным мерапрыемстве з абсалютна неафіцыйнай назвай «Хлапечнік Тэа». Пажадаюць спеваку ўдачы і скажуць словы падтрымкі не толькі вядомыя беларускія артысты, але таксама пераможца «Еўрабачання-2009», нарвежац з беларускімі каранямі Аляксандр Рыбак і прадстаўнік нашай краіны на «Еўрабачанні-2008» Руслан Аляхно, які цяпер жыве і працуе ў Расіі.

А ўжо 28 красавіка беларуская дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні Белтэлерадыёкампаніі Маратам Маркавым адправіцца ў Данію, дзе стартуе так званы «Еўратыдзень». 30 красавіка ў Тэа адбудзецца першая рэпетыцыя на сцэне B&W Hallerne на востраве Рэфсхалеюн, дзе пройдзе конкурс, 3 мая — другая рэпетыцыя і прэс-канферэнцыя для прадстаўнікоў міжнародных СМІ.

ПРОСТАЯ МОВА

— Каб добра выступіць на «Еўрабачанні», не патрэбна мільёнаў долараў! Галоўнае, каб песня і нумар былі зроблены прафесійна, якасна і з густам.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

«Прамая лінія»

Да ўвагі паляўнічых і рыбаловаў!

26 чэрвеня ўступае ў сілу новая рэдакцыя правілаў вядзення палявання і рыбалоўства. Якія дакументы патрэбны, каб займацца такімі папулярнымі відамі рыбалкі, як тролінг і падводнае паляванне? Якія перавагі дае членства ў Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў? На гэтыя і іншыя пытанні падчас «прамой лініі» адкажа **старшыня Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Юрый Іванавіч ШУМСКІ.** Задаць пытанні можна **22 красавіка з 12.00 да 13.00 гадзін** па тэлефонах: **80172871866, 80172871871.** Папярэднія пытанні можна пакінуць, патэлефанаваўшы па нумары **80172871872**.

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2014 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	на 01.04.2014	на 01.04.2013
1	2	3	5	6
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	577 670.5	389 427.6
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	11 597.5	12 414.6
4	Средства в Национальном банке	1103	760 949.3	1 281 720.9
5	Средства в банках	1104	1 006 365.4	1 297 744.7
6	Ценные бумаги	1105	2 237 437.1	1 462 828.2
7	Кредиты клиентам	1106	14 660 320.4	12 205 410.1
8	Производные финансовые активы	1107	-	194.6
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	29 785.9	29 785.9
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	1 101 733.1	747 717.2
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	6 179.5	-
12	Прочие активы	1111	177 857.4	193 918.7
13	ИТОГО активы	11	20 569 896.1	17 621 162.5
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	78.7	364 557.7
16	Средства банков	1202	10 153 465.2	8 363 561.2
17	Средства клиентов	1203	6 956 134.6	5 753 857.8
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	90 361.6	391 465.7
19	Производные финансовые обязательства	1205	7.4	606.5
20	Прочие обязательства	1206	327 803.2	229 751.2
21	ВСЕГО обязательства	120	17 527 850.7	15 103 800.1
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	1 174 075.0	1 174 075.0
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	369 717.4	245 426.6
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	594 969.0	464 129.9
27	Накопленная прибыль	1215	903 284.0	633 730.9
28	ВСЕГО капитал	121	3 042 045.4	2 517 362.4
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	20 569 896.1	17 621 162.5

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 3 месяца 2014 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	за 3 месяца 2014 года	за 3 месяца 2013 года
1	2	3	5	6
1	Процентные доходы	2011	577 080.4	458 717.9
2	Процентные расходы	2012	251 014.1	241 884.6
3	Чистые процентные доходы	201	326 066.3	216 833.3
4	Комиссионные доходы	2021	153 110.3	113 831.5
5	Комиссионные расходы	2022	77 581.2	28 412.4
6	Чистые комиссионные доходы	202	75 529.1	85 419.1
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	935.7	121.9
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	1 264.8	23 139.7
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	23 717.2	23 842.2
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(3 062.5)	(11 183.0)
11	Чистые отчисления в резервы	207	98 587.2	65 766.8
12	Прочие доходы	208	9 917.6	2 910.5
13	Операционные расходы	209	175 947.5	126 519.7
14	Прочие расходы	210	10 925.6	23 580.0
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	148 907.9	125 217.2
16	Налог на прибыль	212	25 996.4	23 189.4
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	122 911.5	102 027.8

Председатель Правления П.В. Каллаур

Главный бухгалтер Л.А. Филиппова

Дата подписания 7 апреля 2014 года

Отчетность размещена на сайте **www.belveb.by** в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность за 2014 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 № 6. УНП 100010078.